# АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ДЗЕЙНАСЦІ СЕКЦЫІ “ЮНЫ ФІЛОЛАГ” ЗАВОЧНАЙ ШМАТПРАДМЕТНАЙ ШКОЛЫ
## (з вопыту работы)

**Доўгаль Дмітрый Аляксандравіч**
старшы выкладчык кафедры беларускай і рускай моў
установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”
(г. Магілёў, Беларусь)

Істотным фактарам павышэння якасці адукацыі з’яўляецца арганізацыя эфектыўнага ўзаемадзеяння паміж установамі адукацыі розных узроўняў. На базе дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Абласны цэнтр творчасці” на працягу многіх гадоў дзейнічае завочная шматпрадметная школа (ЗШШ), выкладчыкамі якой з’яўляюцца спецыялісты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова. У 2015/2016 вучэбным годзе ў школе прайшлі навучанне амаль 1700 школьнікаў 5–11 класаў па дзевяці прадметах. Для вучняў, якія выяўляюць цікавасць да вывучэння беларускай, рускай і англійскай моў, створаны секцыі “Юны філолаг”. Кірунак “Беларуская мова” ў 2015/2016 годзе абраў 271 вучань з Магілёва, Бабруйска і 18 раёнаў Магілёўскай вобласці (найбольшую актыўнасць праявілі вучні Чавускага і Крычаўскага раёнаў). У працы са школьнікамі і іх педагогамі ў ЗШШ выкарыстоўваюцца разнастайныя арганізацыйныя формы работы:

– дыстанцыйнае выкананне вучэбных рознаўзроўневых заданняў па беларускай мове, іх праверка і аналіз;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– выязныя вучэбныя зборы з мэтай правядзення індывідуальных і групавых кансультацый для вучняў і настаўнікаў;

– вучэбныя зборы ў ДУДА "Абласны цэнтр творчасці", якія ўключаюць лекцыйныя і практычныя заняткі, экскурсіі;

– штомесячныя кансультацыі ў рэжыме анлайн з дапамогай тэхналогіі Skype.

Пэўны час вывучэнне беларускай мовы ў ЗШШ ажыццяўлялася ў двух блоках: "Сінтаксіс" (8–9 класы) і "Маўленне" (10–11 класы). З 2015/2016 навучальнага года арганізавана праца са школьнікамі 6 і 7 класаў у межах вучэбнага блока "Марфалогія (часціны мовы)", кіраўніком якога выступіў аўтар дадзенага артыкула Увядзенне новага кірунку выклікала неабходнасць распрацоўкі адпаведнай вучэбна-праграмнай і вучэбна-метадычнай дакументацыі.

У праграму па беларускай мове былі ўключаны пытанні тых раздзелаў школьнага курса мовы, якія вывучаюцца ў 6 і 7 класах устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Змест матэрыялу адпавядае вучэбнай праграме агульнаадукацыйных устаноў і скіраваны на фарміраванне моўнай, камунікатыўнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый школьнікаў. Дзейнасць секцыі прадугледжвае вырашэнне шэрагу вучэбных задач:

– замацаваць і паглыбіць веды школьнікаў па ўсіх раздзелах беларускай мовы, якія вывучаюцца ў 6 і 7 класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі;

– удасканальваць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць вучняў;

– спрыяць развіццю маўлення вучняў праз пашырэнне слоўнікавага запасу і фарміраванне сінтаксічнага ладу маўлення;

– спрыяць выпрацоўцы навыкаў самастойнай працы з даведачнай літаратурай;

– выхоўваць цікавасць да беларускай мовы і свядомае стаўленне да мовы як феномена культуры.

Асноўным сродкам рэалізацыі дадзеных задач сталі распрацаваныя намі рознаўзроўневыя работы, кожная з якіх прадугледжвае засваенне асобнага фрагмента марфалагічнай сістэмы сучаснай беларускай мовы – ад назоўніка да службовых часцін мовы. Забеспячэнню трывалых ведаў, уменняў і навыкаў садзейнічаюць работы, прысвечаныя ўводнаму, прамежкаваму і выніковаму паўтарэнню вывучанага.

Пры вывучэнні ўсіх тэм прадугледжана работа па развіцці слоўнікавага запасу школьнікаў, удасканаленні правапісных навыкаў, павышэнні культуры маўлення. Так, у 6 класе арфаграфічныя задачы вырашаюцца ў 28 заданнях (15,5% ад агульнай колькасці), лексічнай рабоце прысвечаны 18 заданняў (10%), фразеалагізмы выкарыстоўваюцца ў 11 выпадках (6,1%). Пэўныя заданні скіраваны на развіццё агульнага кругагляду школьнікаў: *знайдзіце ў тэксце па два прыклады раслін з наступных ярусаў лесу: высокія дрэвы, нізкія*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*дрэвы і хмызнякі, травы; з названых у тэксце рэк выпішыце тыя, якія працякаюць па тэрыторыі Магілёўскай вобласці; выпішыце з тэксту назвы святаў і ўкажыце, калі яны адзначаюцца*, і інш. Выкананне падобных заданняў прадугледжвае самастойную працу школьнікаў не толькі з падручнікам па беларускай мове, але і з разнастайнай даведачнай літаратурай, садзейнічае развіццю міжпрадметных сувязей.

Кожная з дванаццаці работ марфалагічнага блока, адпавядаючы дыдактычным прынцыпам дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі, з'яўляецца рознаўзроўневай. Гэта дасягаецца як ступенню складанасці прапанаваных заданняў, так і формай іх прэзентацыі. З аднаго боку, кожная работа абавязкова ўключае заданні на аднаўленне матэрыялу на ўзроўні разумення (сярэдні ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу), на прымяненне ведаў для вырашэння новай задачы (дастатковы ўзровень) і на прымяненне ведаў у нестандартных сітуацыях, самастойнае апісанне, тлумачэнне і пераўтварэнне моўных адзінак (высокі ўзровень). З другога – работа складаецца з частак А, Б і В, якія ўключаюць розныя па форме заданні. У частцы А прапануецца 10 тэставых пытанняў закрытага тыпу з двума варыянтамі адказу ("так" або "не"); у частцы Б – таксама 10 пытанняў закрытага тыпу з чатырма варыянтамі адказу, з якіх адзін з'яўляецца верным; у частцы В падаецца 10 заданняў па фрагменце тэксту, на якія вучні павінны прапанаваць уласны адказ. Узоры пытанняў і заданняў з кожнай часткі змешчаны ў табліцы.

*Табліца*

Узоры пытанняў і заданняў у рознаўзроўневых работах па беларускай мове для вучняў 6–7-х класаў

| Частка | Пытанне / заданне | Зона адказу |
|---|---|---|
| А | Уласныя назоўнікі – гэта назвы аднародных прадметаў, з'яў і паняццяў. | *ТАК* *НЕ* |
| Б | Які з назоўнікаў у форме роднага склону адзіночнага ліку мае канчатак *-у*: | ✓ *табун*<br>✓ *натоўп*<br>✓ *клас*<br>✓ *батальён* |
| В | Выпішыце з прапанаванага тэксту па адным прыкладзе<br>– асабовага назоўніка,<br>– абстрактнага назоўніка,<br>– назоўніка з асновай на мяккі зычны,<br>– назоўніка 3-га скланення,<br>– назоўніка, які ўжываецца толькі ў форме множнага ліку | *1)*<br>*2)*<br>*3)*<br>*4)*<br>*5)* |

Правільны адказ на кожнае пытанне часткі А ацэньваецца двума баламі, часткі Б – трыма, часткі В – пяццю. Такім чынам, максімальная сума за выкананне работы складае 100 балаў. Дадзены падыход робіць ацэньванне работ зразумелым для школьнікаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дыдактычным матэрыялам для заданняў частак А і Б выступаюць пераважна словы, словазлучэнні і сказы (у тым ліку народныя выслоўі). Заданні часткі В складзены па рознажанравых і рознатэматычных тэкстах, уключаных у спіс твораў для дадатковага чытання (казка “Купальскія светлякі” Я. Коласа, апавяданне “Кніганошы” У. Караткевіча, кніга нарысаў “Зялёны лісток на планеце Зямля” Я. Сіпакова, аповесць А. Кобец-Філімонавай “Жаваранкі над Хатынню” і інш.), што садзейнічае развіццю чытацкага кругагляду і фарміраванню чытацкай самастойнасці школьнікаў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Дэбютны год дзейнасці секцыі “Юны філолаг” для вучняў 6 і 7 класаў засведчыў цікавасць школьнікаў і іх педагогаў да гэтай формы пазакласнай работы, дазволіў вызначыць перспектыўныя кірункі павышэння якасці філалагічнай адукацыі. Адным з такіх напрамкаў нам бачыцца стварэнне секцыі “Юны філолаг” для вучняў 4 і 5 класаў, што забяспечыць пераемнасць у вывучэнні беларускай мовы на I і II ступенях агульнай сярэдняй адукацыі і дазволіць стварыць у межах ЗШШ поўнае вучэбна-метадычнае суправаджэнне школьнага курса беларускай мовы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова